# КАНТРОЛЬНЫЯ ТЭСТЫ ПА ФАНЕТЫЦЫ І АРФАЭПІІ

## Тэст 1

**1. Адзначце сегментныя, або лінейныя, фанетычныя адзінкі:**

1) гук  4) маўленчы такт
2) абзац  5) склад
3) тэкст

**2. Адзначце няправільнае сцверджанне:**

1) Гук — найдрабнейшая адзінка, пры дапамозе якой ствараецца знешняя фізічная абалонка слоў.
2) Гукі — гэта элементарныя фанетычныя адзінкі, якія ў сукупнасці складаюць гукавую матэрыю мовы.
3) Гук — найдрабнейшы элемент гукавой сістэмы мовы, элементарная фанетычная адзінка.
4) Гук — гэта найменшы членараздзельны элемент гукавой сістэмы мовы, утвораны органамі маўлення за адну артыкуляцыю.
5) Гук — найдрабнейшая адзінка мовы.

**3. Адзначце галосны гук пярэдняга рада, верхняга пад'ёму, нелабіялізаваны:**

1) [о]  4) [э]
2) [а]  5) [ы]
3) [і]

**4. Адзначце правільнае: паводле месца ўтварэння зычныя гукі падзяляюцца на:**

1) губныя  4) насавыя
2) язычныя  5) паднябенныя
3) зубныя  6) бакавыя

**5. Адзначце губна-губныя гукі:**

1) [б] 4) [м]
2) [п]  5) [ў]
3) [ф]

репозиторий

**6. Адзначце шыпячыя гукі:**

1) [дж] 4) [ж]
2) [ш] 5) [ч]
3) [ц]

**7. Адзначце санорныя гукі:**

[н]
[т]
[ў]
[п]
[ф’]

**8. Адзначце зычны гук шумны, глухі, пярэднеязычны, зубны, выбухны:**

1) [в’] 4) [р]
2) [т] 5) [н’]
3) [м]

**9. Адзначце зычны гук санорны, змычна-праходны, бакавы, пярэднеязычны, цвёрды:**

1) [м] 4) [р]
2) [н] 5) [л]
3) [с]

**10. Адзначце словы, у якіх парныя па глухасці — звонкасці зычныя знаходзяцца ў моцнай пазіцыі:**

1) гром 4) рад
2) касьба 5) сады
3) лодка

**11. Адзначце словы, у якіх парныя па цвёрдасці — мяккасці зычныя знаходзяцца ў моцнай пазіцыі:**

1) нёс 4) дзве
2) стань 5) з’езд
3) просьба

**12. Адзначце звонкія зычныя гукі:**

1) [л] 4) [г]
2) [ж] 5) [в]
3) [ф]

Репозиторий

**13. Адзначце зычныя гукі, якія не ўтвараюць пары па звонкасці — глухасці:**

1) [м]
2) [ф]
3) [дз’]
4) [б]
5) [р]

**14. Адзначце словы, у якіх назіраюцца пазіцыйныя змены гукаў:**

1) абласны
2) імхі
3) журавель
4) мёд
5) пад’езд

**15. Адзначце словы, пры вымаўленні якіх адбываецца асіміляцыя зычных гукаў:**

лічба
счарнець
клён
экзотыка
Ядвіга

**16. Адзначце словы, у якіх ёсць выбухны зычны гук:**

1) гузік
2) гантарэзны
3) гегемонія
4) гірса
5) газета

**17. Адзначце словы з падоўжанымі зычнымі гукамі:**

1) будавацца
2) каменны
3) наваколле
4) чытанне
5) злавацца

**18. Адзначце пары слоў з пазіцыйнымі чаргаваннямі галосных гукаў:**

1) пень — пня
2) ішлі — падышлі
3) неба — нябёсы
4) убачыў — яна ўбачыла
5) уцерці — уціраць

**19. Адзначце пары слоў з гістарычнымі чаргаваннямі галосных гукаў:**

1) лес — лясы
2) свет — світаць
3) несці — нёс
4) званок — званка
5) імя — імені

Рэпазіторый

**20. Адзначце пары слоў з пазіцыйнымі чаргаваннямі зычных гукаў:**

1) праезд — праязны    4) галава — галоўка
2) вітаеш — вітаешся    5) вокны — акно
3) вязаць — вяжу

**21. Адзначце пары слоў з гістарычнымі чаргаваннямі зычных гукаў:**

1) хлеб — хлебны    4) пісала — пісаў
2) правіць — праўлю    5) вуды — вуджу
3) ноч — ноччу

**22. Адзначце словы з рухомым націскам:**

1) цесны    4) луг
2) хата    5) твор
3) лета

**23. Адзначце словы з нерухомым націскам:**

1) метр    4) парта
2) сцэна    5) адзінаццаць
3) ігруша

**24. Адзначце кампаненты інтанацыі:**

тэмп    інтэнсіўнасць мелодыка    тэмбр
фанетычнае слова

**25. Адзначце словы, у якіх націск пастаўлены правільна:**

1) бульбяны    4) жáльба
2) выпадак    5) зáпечак
3) садавíна

## Тэст 2

**1. Адзначце суперсегментныя, або нелінейныя, фанетычныя адзінкі:**

1) фанетычнае слова    4) энклітыкі
2) інтанацыя    5) націск
3) праклітыкі

РЕПОЗИТОРИЙ

**2. Адзначце няправільнае сцверджанне:**

1) Фанема — гэта найменшая структурная частка слова, якая выражае пэўнае лексічнае ці граматычнае значэнне.
2) Фанема — гэта найдрабнейшая адзінка мовы.
3) Фанема — фанетычная адзінка, якая складаецца з аднаго ці больш гукаў і вымаўляецца адным выдыхальным штуршком паветра.
4) Фанема — найменшая непадзельная гукавая адзінка мовы, якая служыць для пабудовы і адрознівання марфем, слоў і словаформ.
5) Фанема — найдрабнейшая адзінка, пры дапамозе якой ствараецца знешняя фізічная абалонка слоў.

**3. Адзначце галосны гук сярэдняга рада, верхняга пад’ёму, нелабіялізаваны:**

1) [і] 4) [а]
2) [э] 5) [у]
3) [ы]

**4. Адзначце правільнае: паводле спосабу ўтварэння зачныя гукі падзяляюцца на:**

1) выбухныя
2) фрыкатыўныя
3) змычна-праходныя
4) афрыкаты
5) паднябенныя
6) вібранты

**5. Адзначце губна-зубныя гукі:**

1) [в] 4) [р]
2) [п] 5) [в’]
3) [ф]

**6. Адзначце свісцячыя гукі:**

1) [дз’]
2) [з]
3) [ц]
4) [с]

рэпазіторый

3)

[ч]

**7. Адзначце санорныя гукі:**

1) [б] 4) [ж]
2) [м’] 5) [д]
3) [р]

**8. Адзначце палатальныя гукі:**

1) [с’] 4) [й]
2) [г’] 5) [дж]
3) [дз’]

**9. Адзначце зычны гук шумны, звонкі, выбухны, губна-губны:**

1) [м] 4) [н]
2) [д] 5) [ў]
3) [б]

**10. Адзначце зычны гук санорны, сярэднеязычны, фрыкатыўны, палатальны:**

1) [м’] 4) [ф]
2) [в’] 5) [с’]
3) [й]

**11. Адзначце словы, у якіх парныя па глухасці — звонкасці зычныя знаходзяцца ў слабай пазіцыі:**

1) зуб 4) двор
2) дарожка 5) гады
3) галыцьба

12. Адзначце словы, у якіх парныя па цвёрдасці — мяккасці зычныя знаходзяцца ў слабай пазіцыі:

1) спіць 4) сяду
2) кусцік 5) зведаць
3) вугаль

**13. Адзначце звонкія зычныя гукі:**

1) [н] 3) [д]
2) [к] 4) [л’]

Репозиторий

3) [дж]

**14. Адзначце зычныя гукі, якія не ўтвараюць пары па цвёрдасці — мяккасці:**

1) [ц] 4) [ч]
2) [т] 5) [й]
3) [р]

**15. Адзначце словы, у якіх назіраюцца камбінаторныя змены гукаў:**

1) палескі 4) схіліць
2) далонь 5) навокал
3) у клятве

**16. Адзначце словы, пры вымаўленні якіх адбываецца асіміляцыя зычных гукаў:**

1) адвязаць 4) у Літве
2) прыязджаць 5) к дому
3) згінуць

**17. Адзначце словы, у якіх ёсць выбухны зычны гук:**

1) герой 4) гіпс
2) швагер 5) гільзавы
3) гвалтаўнік

**18. Адзначце словы з падоўжанымі зычнымі гукамі:**

1) уваччу 4) узвышша
2) накрычацца 5) пешшу
3) галлё

**19. Адзначце пары слоў з пазіцыйнымі чаргаваннямі галосных гукаў:**

1) шэсць — шасці 4) гром — грыміць
2) быў у брата — былі ў брата 5) сёлы — сяло
3) іграць — зайграць

**20. Адзначце пары слоў з гістарычнымі чаргаваннямі галосных гукаў:**

1) вяжу — вузел 4) жаць — дажынаць
2) лоб — ілба 5) вясло — вёслы
3) сем — сёмы

Репозиторий

**21. Адзначце пары слоў з пазіцыйнымі чаргаваннямі зычных гукаў:**

1) загадаць — загадка 4) з болем — з часткай

2) дажджы — дождж 5) страха — страхі

3) свет — свячу

**22. Адзначце пары слоў з гістарычнымі чаргаваннямі зычных гукаў:**

1) капаць — капля 4) хлебам — у хлебе

2) крык — крычу 5) рука — руцэ

3) ціш — зацішша

**23. Адзначце словы з рухомым націскам:**

1) ножык 4) паласа

2) серп 5) чарада

3) бусел

**24. Адзначце словы з нерухомым націскам:**

1) іголка 4) зуб

2) чатырнаццаць 5) хто-небудзь

3) бездань

**25. Адзначце словы, у якіх націск пастаўлены правільна:**

1) ільняны 4) грамадзянін

2) жа́люзі 5) дакуме́нт

3) мысле́нне

репозиторий